УДК 392:273.2(476.5)

# СТАРАВЕРЫ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ ЗАМЕЖНЫХ ВУЧОНЫХ (1950–2000-я гг.)[1]

**Аўсейчык Уладзімір Яўгенавіч,**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Навапалацк, Беларусь)

*У артыкуле разглядаюцца даследаванні замежных вучоных аб стараверах Паўночнай Беларусі. У артыкуле прааналізаваны працы, якія былі апублікаваныя*

[1] Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па тэме «Фольклорное осмысление и интерпретация истории в традиционной культуре белорусов Подвинья конца XIX – начала XXI вв.», якая выконваецца ў рамках задання 1.2.06 «Фольклорное наследие белорусов в современном славянском мире: параллели, генезис, локальные особенности» (2016-2020 гг.; № 20160589).

*з сярэдзіны XX ст. і да нашага часу. Прыходзім да высновы, што дадзеная праблематыка цікавіла літоўскіх, латвійскіх і польскіх навукоўцаў. Інтарэс з боку літоўскіх і латвійскіх даследчыкаў быў абумаўлены агульнасцю лёсаў стараверскага насельніцтва Літвы, Латвіі і Беларусі. А цікавацъ польскіх вучоных звязана з даследаваннямі этнакультурных працэсаў у міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі, якая ў той перыяд знаходзілася ў складзе Польшчы.*

У пасляваенны перыяд у беларускай гістарыяграфіі не было спецыяльных даследаванняў, прысвечаных стараверскаму насельніцтву. У той жа час у 1950–1980-х гг. быў апублікаваны шэраг прац па гісторыі і культуры старавераў на літоўскіх і латвійскіх землях. Некаторыя з гэтых даследаванняў закраналі і старавераў Паўночнай Беларусі. У гэты перыяд вывучэннем старавераў Латвіі займаліся А.А. Заварына [1], А.А. Падмазаў [2-3], Т.С. Макашына [4]. Старавераў Літвы вывучалі В.М. Немчанка [5] і М.К. Сіціцкене [6]. Цікавасць да вывучэння гісторыі і культуры старавераў Паўночнай Беларусі з боку даследчыкаў стараверства ў Літве і Латвіі не была выпадковай. У першую чаргу, яна была абумаўлена агульнасцю лёсаў стараверскага насельніцтва Літвы, Латвіі і Беларусі. Паколькі адзін з асноўных арэалаў пасялення старавераў ва Ўсходняй Еўропе лакалізуецца якраз на беларуска-літоўска-латвійскім памежжы, то геаграфічныя рамкі даследаванняў часта выходзілі за межы кожнай з краін. А таму пры даследаванні літоўскіх і латвійскіх старавераў часта разглядаліся і староверы Падзвіння.

Сярод усіх работ дадзенага перыяду вылучаюцца даследаванні А.А. Заварынай па гісторыі і культуры старавераў Латвіі. У 1956 г. яна абараніла дысертацыю на тэму «Сям'я і сямейны побыт рускага старажыльчаскага насельніцтва Латгаліі ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст.». А ў 1986 г. была апублікавана манаграфія А.А. Заварынай «Рускае насельніцтва ўсходняй Латвіі у другой палове XIX – пачатку XX ст.» [1]. У кнізе А.А. Заварына вельмі падрабязна разгледзела гісторыю і матэрыяльную культуру старавераў Рэжыцкага, Люцынскага і Дзвінскага паветаў Віцебскай губерні. Разам з латгальскімі матэрыяламі даследчыца прааналізавала і матэрыялы з Паўночнай Беларусі. Пры вывучэнні фарміравання рускага стараверскага насельніцтва ва ўсходняй Латвіі даследчыца вызначыла асноўныя накірункі перасялення старавераў (у якасці аднаго з месцаў кампактнага пасялення старавераў вызначыла тэрыторыю ў раёне Друя-Браслаў-Мёры), вылучыла асноўныя этапы пасялення старавераў на землях Латгаліі і Паўночнай Беларусі ў XVII – пачатку XX ст., ахарактарызавала першапачатковыя рэгіёны пасялення старавераў, у т.л. і на падзвінскіх землях. Разглядаючы гаспадарчую спецыфіку стараверскага насельніцтва Латгаліі (земляробства, прылады працы, жывёлагадоўлю), даследчыца шмат увагі ўдзяліла характарыстыцы стараверскага насельніцтва ўсёй Віцебскай губерні. У той жа час, пры аналізе жылля, адзення і традыцыйнай кухні А.А. Заварына матэрыялы пра старавераў з сучасных беларускіх земляў амаль не выкарыстоўвала.

Даследаванні стараверскага насельніцтва Паўночнай Беларусі літоўскімі навукоўцамі працягваліся і ў 1990–2000-х гг. Важную ролю ў вывучэнні гісторыі і культуры старавераў рэгіёна адыгралі літоўскія даследчыкі В.М. Чэкманас, Г.У. Паташанка, Н.А. Марозава, Ю.А. Новікаў.

Даследаваннем стараверскіх гаворак літоўска-латвійска-беларускага памежжа ў 1990–2000-я гг. займаўся прафесар Вільнюскага ўніверсітэта В.М. Чэк-

манас. За перыяд з 1996 г. па 2002 г. даследчык арганізаваў больш дзесяці экспедыцый на тэрыторыі Літвы, Латвіі і Беларусі. У 2000 г. былі абследаваны старaверскія вёскі Пастаўскага і Браслаўскага раёнаў Віцебскай вобласці. Матэрыялы гэтых палявых даследаванняў захоўваюцца ў Дыялектным архіве Цэнтра геалінгвістыкі Інстытута літоўскай мовы ў Вільнюсе [7]. Даследаванні В.М. Чэкманаса [8-9] прысвечаны моўным асаблівасцям стараверскага насельніцтва. На аснове іх аналізу даследчык выдзеліў на тэрыторыі Літвы і сумежных беларускіх і латвійскіх тэрыторыях зоны і арэалы распаўсюджання стараверскага насельніцтва. Важнай высновай В.М. Чэкманаса з'яўляецца вызначэнне тэрыторыі паходжання старавераў літоўска-латвійска-беларускага памежжа. Так, даследчык прыйшоў да высновы, што асноўная маса старавераў рэгіёна з'яўляецца перасяленцамі з паўднёва-усходняй часткі Пскоўскай вобласці і прылеглых тэрыторый Цвярской вобласці.

Прадаўжальніцай даследаванняў В.М. Чэкманаса з'яўляецца Н.А. Марозава. Яна займаецца лінгвістычным вывучэннем старавераў Літвы, а таму і заходняга Падзвіння. Даследчыца ўдакладніла арэалы рассялення старавераў на літоўскіх і памежных з імі беларускіх і латвійскіх землях [12–13]. Н.А. Марозава таксама даследавала кніжную культуру старавераў Рэчы Паспалітай [14], апублікавала шэраг прац гістарыяграфічнага характару [7; 10; 11; 15].

Значнае месца ў даследаванні гісторыі старавераў Літвы належыць Г.У. Паташанку. У працы «Стараверства ў Літве: другая палова XVII – пачатак XIX стст.» (2006) [16] даследчык разгледзеў гісторыю старавераў паўночна-заходняй часткі ВКЛ. А таму на старонках выдання значная ўвага ўдзелена стараверскаму насельніцтву Беларускага Падзвіння (пераважна, яго заходняй частцы). У працы вылучаны этапы пасялення старавераў на гэтых землях, ахарактарызавана геаграфія іх рассялення, прадпрынята спроба прасачыць дэмаграфічныя змены на працягу XVII – пачатку XIX ст., прааналізавана прававое і эканамічнае становішча старавераў у перыяд Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі (да 1825 г.). Асобна даследчык спыняецца на гісторыі стараверсхіх прыходаў Літвы і заходніх раёнах Беларускага Падзвіння (сучасныя тэрыторыі Браслаўскага, Пастаўскага і Шаркаўшчынскага раёнаў Віцебскай вобласці).

Істотная роля ў вывучэнні фальклорнай спадчыны старавераў беларуска-літоўска-латвійскага памежжа належыць Ю.М. Новікаву. Шэраг артыкулаў ён прысвяціў аналізу каляндарных традыцый старавераў памежных беларуска-літоўскіх тэрыторый [17–19]. У 2007–2010 гг. у трох тамах былі апублікаваны матэрыялы па фальклоры старавераў Літвы, падрыхтаваныя Ю.А. Новікавым [20–22]. Першы том выдання змяшчае ўводныя абагульняючыя артыкулы Г.У. Паташанкі «Старaверы Літвы: вехі гісторыі (другая палова XVII – пачатак XXI стст.)» [20, с. 13–28], Ю.А. Новікава «Духоўная спадчына продкаў» [20, с. 29–50], Н.А. Марозавай і В.М. Чэкманаса «Гаворкі старавераў Літвы: асаблівасці і праблемы паходжання» [20, с. 51-70]. Акрамя ўласна літоўскіх матэрыялаў, даследчыкі выкарысталі таксама і матэрыялы з Паўночнай Беларусі. У саміх выданнях таксама апублікаваныя некаторыя фальклорныя тэксты, зафіксаваныя ад старавераў заходняга Падзвіння.

У польскай навуцы ў 2000-я гг. таксама быў апублікаваны шэраг прац, дзе разглядалася гісторыя і культура старавераў паўночнабеларускіх зямель. Так,

польская даследчыца І. Янушэўска-Юркевіч у працы «Нацыянальныя адносіны ў Віленскім краі ў 1920–1939 гг.» (2010) [23] разгледзела становішча старaверскага насельніцтва Віленшчыны (у т.л. і беларускіх тэрыторый) у Польскай дзяржаве ў міжваенны перыяд. Асноўная ўвага была засяроджана на аналізе удзела стараверскага насельніцтва ў палітычным жыцці краіны. У кнізе таксама коратка ахарактарызаваны гаспадарчыя заняткі стараверaў, прыведзены некаторыя статыстычныя даныя. У 2010 г. была апублікавана праца польскага даследчыка А. Хаміньскага (1844–1943 гг.) «Літоўскі моўны арэал у Польскай дзяржаве 1927–1933» [24], якую да друку падрыхтаваў Л. Бендарчук. У даследаванні вылучаны стараверскія вёскі ў Свянцянскім і Браслаўскім паветах (у складзе Польшчы).

Такім чынам, даследваннем гісторыі і культуры стараверaў Паўночнай Беларусі займаліся літоўскія, латвійскія і польскія навукоўцы. Інтарэс з боку літоўскіх і латвійскіх даследчыкаў быў абумаўлены агульнасцю лёсаў стараверскага насельніцтва Літвы, Латвіі і Беларусі. А цікавaць польскіх вучоных звязана з даследаваннямі этнакультурных працэсаў у міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі, якая ў той перыяд знаходзілася ў складзе Польшчы.

## Літаратура


1. Заварина, А.А. Русское население восточной Латвии во второй половине XIX – начале XX века: Историко-этнографический очерк / А.А. Заварина. – Рига: Зинатне, 1986. – 246 с.
2. Подмазов, А.А. Старообрядчество в Латвии / А.А. Подмазов. – Рига: Лиесма, 1970. – 112 с.
3. Подмазов, А.А. Современная религиозность: особенности, динамика, кризисные явления / А.А. Подмазов. – Рига: Зинатне, 1985. – 162 с.
4. Макашина, Т.С. Фольклор и обряды русского населения Латгалии / Т.С. Макашина. – М.: Наука, 1979. – 160 с.
5. Немченко, В. Русские старожилы Литвы и их говоры / В. Немченко // Kalbotyra. – 1963. – № VII. – P. 63–86.
6. Сивицкене, М.К. Русские говоры Литвы в связи с исходной локализацией / М.К. Сивицкене // Псковские говоры в их прошлом и настоящем: межвуз. сб. науч. тр. / Ленинградский гос. педагогический ин-т им. А.И.Герцена; отв. ред. Л.Я. Костючук. – Ленинград, 1988. – С. 126–134.
7. Морозова, Н. Научное наследие В.Н. Чекмонаса (1936–2004): изучение старообрядчества Литвы / Н. Морозова // Kalbotyra: Slavistica Vilnensis. – 2017. – № 62. – P. 139–150.
8. Чекмонас, В.Н. К социолингвистической характеристике старообрядческих говоров Литвы / В.Н. Чекмонас // Труды по русской и славянской филологии: Лингвистика. Новая серия. – Тарту: Из-во Тартуского университета, 2000. – Т. IV: Русские староверы за рубежом. – С. 200–224.
9. Чекмонас, В. Об основных этапах социолингвистической истории старообрядчества Литвы / В. Чекмонас // Труды по русской и славянской филологии: Лингвистика. Новая серия. – Тарту: И-во Тартуского университета, 2000. – Т. III: Языки диаспоры: проблемы и перспективы. – С. 135–147.
10. Морозова, Н.А. Литовское старообрядчество: история, культура, язык (библиографический указатель) / Н.А. Морозова // Kalbotyra: Slavistica Vilnensis. – 2001. – №50(2). – P. 195–218.
11. Морозова, Н. Библиография научных трудов В.Н. Чекмонаса / Н. Морозова // Kalbotyra: Slavistica Vilnensis. – 2009. – № 54(2). – P. 21–36.
12. Морозова, Н.А. Староверы Литвы: места компактного проживания в прошлом и настоящем / Н.А. Морозова // Историко-культурный ландшафт Северо-Запада / Четвертые Шёгреновские чтения: сб. статей. – Санкт-Петербург: Европейский Дом, 2011. – С. 248–259.
13. Морозова, Н. Староверы Литвы: к вопросу о местах компактного проживания в прошлом и настоящем / Н. Морозова // Перекрестки. – 2012. – № 3–4. – С.136–147.
14. Морозова, Н. Сочинения старообрядцев-беспоповцев в Речи Посполитой в XVIII веке / Н. Морозова // Kalbotyra: Slavistica Vilnensis. – 2013. – № 58(2). – P. 79–97.
15. Морозова, Н. Анатолий Павлович Непокупный и изучение старообрядческих говоров Литвы / Н. Морозова // Kalbosistorijosir dialektologijos problemos 5. – Vilnius: Lietuvių kalbos institutas, 2018. – P. 250–273.

16. Поташенко, Г. Староверие в Литве: Вторая половина XVII – начало XIX вв. Исследования, документы, материалы / Г.Поташенко. – Вильнюс: Aidai, 2006. – 543 с.

17. Новиков, Ю.А. Пасхальный обход дворов у старообрядцев белорусско-литовского пограничья / Ю.А. Новиков // Kalbotyra: Slavistica Vilnensis. – 2002. – № 51. – P. 81–92.

18. Новиков, Ю.А. Фольклор старообрядцев стран Балтии (истоки, динамика развития, особенности бытования)/ Ю.А. Новиков // Kalbotyra: Slavistica Vilnensis. – 2009. – T. 54. – P. 140–155.

19. Новиков, Ю.А. Календарные праздники старообрядцев стран Балтии / Ю.А. Новиков // Славянские чтения VII. – Daugavpils, 2009. – P. 12–18.

20. Фольклор старообрядцев Литвы: Тексты и исследования. Т. 1: Сказки. Пословицы. Загадки / Изд. подгот. Ю. Новиков; вст. статьи Г. Поташенко, Ю. Новикова, Н. Морозовой и В. Чекмонаса. – Вильнюс: Вильнюсский педагогический университет, 2007. – 570 с.

21. Фольклор старообрядцев Литвы: Тексты и исследования. Т. 2: Народная мифология. Поверья. Бытовая магия / Изд. подгот. Ю. Новиков. – Вильнюс: Вильнюсский педагогический университет, 2009. – 568 с.

22. Фольклор старообрядцев Литвы: Тексты и исследования. Т.3: Народные песни. Частушки. Детский фольклор. / Изд. подгот. Ю. Новиков; при участии Ю. Марченко, И. Захаровой, Н. Захарова. – Вильнюс: Вильнюсский педагогический университет, 2010. – 564 с.

23. Januszewska-Jurkiewicz, J. Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920–1939 / J. Januszewska-Jurkiewicz. – Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego, 2010. – 710 s.

24. Chomiński, O. Obszar językowy litewski w państwie polskim 1927–1933 / O. Chomiński // Acta Baltico-Slavica. – 2010. – № 34. – S. 197–261.